*Гоўзіч І.М.*
***БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА. ХІ КЛАС***



# ТЭМА 7. ІВАН ЧЫГРЫНАЎ

1. **Зрабіце цытатную характарыстыку** старога Дземідзёнка з твора Івана Чыгрынава «Дзівак з Ганчарнай вуліцы». Выкарыстайце яе пра адказе на пытанне «Якую функцыянальную ролю выконвае партрэтная характарыстыка ў апавяданні?».

2. **Перакажыце тэкст, змяніўшы асобу апавядальніка** з 3 на 1 такім чынам, каб Дземідзёнак «расказваў» слухачу пра сваё жыццё.

3. Узгадайце і пералічыце творы, у якіх вобразы птушак адыгрываюць сімвалічнае значэнне, раскрыйце змест вобразаў-сімвалаў птушак.

4. Выкарыстайце прыём мастацкага расказвання – **дапішыце канцоўку твора і правядзіце конкурс на лепшы эпілог**.

5. **Стварыце кадраплан апавядання** Івана Чыгрынава «У ціхім тумане», кожны кадр падпішыце сказам, які перадае яго асноўную думку.

6. Паспрабуйце «разгарнуць» тэму калектывізацыі ў апавяданні І. Чыгрынава. Што пры гэтым можа змяніцца ў нашым стаўленні да герояў твора.

7. Падрыхтуйце **міні-дыспут** па праблемным пытанні: Ці выклікае спачуванне ў чытача маці здрадніка (па старонках апавядання Івана Чыгрынава “У ціхім тумане”)?

8. Напішыце **сачыненне** на адну з прапанаваных тэм: «Іван Чыгрынаў – майстар мастацкай дэталі», «Іван Чыгрынаў – партрэтыст», «Майстэрства псіхалагічнага аналізу ў прозе Івана Чгрынава», «Адлюстраванне падзей Вялікай Айчыннай вайны ў творах К. Чорнага, В. Быкава і І. Чыгрынава», «Рысы індывідуальнага стылю пісьменніка».

9. **Дапамажыце кветцы аднавіць пялёсткі, у якіх пазначаюцца назвы твораў Івана Чыгрынава:**




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ